# Іх імёнамі названыя…

***Да 110-годдзя з дня нараджэння.***

У нашым родным пасёлку Карэлічы ёсць вуліцы, названыя не толькі ў гонар ураджэнцаў нашага раёна, але і ў гонар знакамітых людзей былой вялікай краіны СССР і нашай роднай Беларусі.



Гэты ўспамін пра героя Савецкага Саюза **Мікалая Францавіча Гастэла**. Бацька мужнага лётчыка Мікалая Францавіча Гастэлы, Франц Платонавіч Гастылла родам з вёскі Плужыны Райцаўскай воласці Навагрудскага павета Мінскай губерні (цяпер Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці) ў 1900 годзе з'ехаў у Маскву і ўладкаваўся на працу ў чыгуначныя майстэрні. Прозвішча яго з часам адвольна змянілася на Гастэла. Ён ажаніўся на рускай жанчыне Анастасіі Сямёнаўне Кутузавай, а 6 мая 1907 года ў іх сям'і нарадзіўся сын Мікалай.

Дзяцінства Мікалая Францавіча праходзіла ў гарадскіх умовах рабочага асяроддзя, дзе і пачаў фармавацца цвёрды і энергічны характар юнака. Мікалай Францавіч з дзяцінства марыў стаць лётчыкам. У 1914 годзе Мікалай Францавіч паступіў у трэцяе Сакольніцкае гарадское вучылішча А.С.Пушкіна (цяпер Маскоўская школа №33), аднак рэвалюцыйныя падзеі перашкодзілі далейшай вучобе.

У 1918 годзе сям'я з-за голаду з'язджае да далёкіх сваякоў у Башкірыю, але праз год вяртаецца назад у сувязі з цяжкасцямі, якія там склаліся, а Мікалай Францавіч зноў вучыцца ў тым жа вучылішчы да 1924 года.

У пятнаццацігадовым узросце Мікалай становіцца вучнем цесляра. Ужо праз год сям'я пераехала ў Мурам, дзе юнак уладкаваўся працаваць на

чыгуначны рамонтны завод слесарам. Мікалай Францавіч да гэтага часу стаў патрыятычна настроеным юнаком і ў 1928 годзе становіцца членам ВКП(б).

У 1930 годзе сям'я зноў вяртаецца ў Маскву. Мікалай Францавіч ўладкоўваецца на працу ў Першы дзяржаўны механічны завод будаўнічых машын імя 1-га Мая, а затым у перыяд 1930-1932 гады сям'я пражывае ў пасёлку Хлебнікава, што недалёка ад Масквы.

У канцы трыццатых гадоў мінулага стагоддзя навісла пагроза вайны. У краіне перыядычна абвяшчаюцца спецыяльныя наборы ў Чырвоную Армію. У 1932 годзе па адным з такіх набораў Мікалай Гастэла трапляе ў Луганскае лётнае вучылішча, дзе пачынае асвойваць навыкі палётаў на бамбардзіроўшчыку.

Пасля заканчэння вучылішча Мікалая Францавіча накіроўваюць на вайсковую службу ў Растоў-на-Доне ў авіяцыйную брыгаду цяжкіх бамдардзіроўшчыкаў. Мікалай Францавіч да 1939 года цалкам авалодаў прафесіяй баявога лётчыка і прыняў актыўны ўдзел у баявых дзеяннях: у пачатку на Халхін-Голе камандзірам эскадрыліі, затым у савецка-фінскую вайну 1939-1940 гадоў, а яшчэ пазней у Бесарабіі і Паўночнай Букавіне, куды былі накіраваны савецкія вайскоўцы.

З восені 1940 года Мікалай Францавіч быў пераведзены на вайсковую службу ў авіяцыйную эскадрыллю, размешчаную ў горадзе Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці, а затым, ужо да гэтага часу на пасадзе капітана, у авіяцыйны гарадок Бараўское.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны 22 чэрвеня 1941 года Мікалай Францавіч працягваў камандаваць эскадрылляй, здзяйсняў баявыя вылеты, наносячы бомбавыя ўдары па надыходзячым вайскам праціўніка.

Раніцай 26 ліпеня 1941 года, падчас паветранай атакі на варожую танкавую калону у раёне дарогі Маладзечна-Радашковічы, бамбардзіроўшчык Мікалая Францавіча быў падбіты зенітнай артылерыяй праціўніка і не мог даляцець да аэрадрому. Ахопленую полымем машыну Мікалай Францавіч накіраваў у самую гушчу варожай тэхнікі на дарозе. Раздаўся магутны выбух, гераічны экіпаж

загінуў, наносячы ворагу сур'ёзны ўрон. Гэта быў мужны ўчынак савецкіх воінаў, годны іх неўміручасці і вечнай народнай памяці.

За гэты бясстрашны ўчынак, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 ліпеня 1941 года, капітану Мікалаю Францавічу Гастэла нададзена званне Героя Савецкага Саюза з ўзнагароджаннем ордэнам Леніна і медалём “Залатая Зорка”. Загадам Міністра Абароны СССР, капітан Мікалай Францавіч Гастэла навечна залічаны ў спісы аднаго з авіяцыйных дзеячых палкоў. Помнікі Мікалаю Францавічу ўстаноўлены ў Маскве, Мінску, на тэрыторыі Варашылаўскага вышэйшага ваенна-авіяцыйнага вучылішча штурманаў. На будынку Маскоўскай школы, дзе вучыўся герой, устаноўлена мемарыяльная дошка. Яго іменем названы саўгасы, калгасы, фабрыкі, заводы, рачныя суда, шахта і цеплаход.

У Карэліцкім раёне яго іменем названа вуліца ў гарадскім пасёлку Карэлічы, а ў студзені 1949 года быў арганізаваны калгас імя Гастэлы ў вёсцы Плужыны. Пасля ўкрупнення калгасаў у лютым 1952 года, цэнтр калгаса імя Гастэлы быў перанесены ў вёску Райца. З 5 лютага 2003 года калгас імя Гастэлы пераіменаваны ў сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў “Свіцязянка-2003”. На мемарыяле загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Райца ўстаноўлена стэла Герою.

У XXI стагоддзі сталі бурыць многія непарушныя ісціны з даўніх часоў. Але высвятляць, хто ў большай ступені герой, а хто ў меньшай, проста неэтычна. Грэшна чапаць даніну павагі, якая склалася стагоддзем да людзей, якія аддалі жыццё дзеля перамогі, гэта апаганьвае не толькі іх, але і многія тысячы іншых загінуўшых пераможцаў. Пераасэнсаванне подзвігу Мікалая Гастэлы так і не знайшло сцвярджальных доказаў і народная памяць аб ім жыве і будзе жыць вечна ў людскіх сэрцах.




***Вуліца М.Ф.Гастэла ў гарадскім пасёлку Карэлічы. 2016 год.***

**Заўвага:** асобныя факты ўзяты з успамінаў сваякоў у 50-я гады XX стагоддзя.

Выкарыстаная літаратура:

*Беларуская энцыклапедыя: Рэдкал. Г.П.Пашкоў і інш. Мінск Бел.Эн. 1996-2004 гг. Т.5. с.86

*Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Маладзечна і Маладзечанскага раёна. Минск. Беларусь. 2002 г. с.137-138

*Их именами названы… Энциклопедический справочник. Минск. 1987 г. с.138

ВЕТЭРАН ПРАЦЫ, КРАЯЗНАЎЦА Б.К. НАВІЦКІ